Творчество – это процесс постоянного поиска новых технологий культуры единства противоположностей и оценка их на основе критериев моральных истин исторической памяти народа и изменчивости объектов стратегий воспроизводства сил антиэнтропии человека, субъекта этнических форм культуры.

В процессе моделирования этнические формы исторической памяти народа являются необходимой основой моральных истин и опыта их творчества

Выводы. Диалектика форм культуры, искусства и сил политического управления государством на основе моральных истин исторической памяти народа превращается в отношения синергетики и воспроизводства системных функций семьи, структур экономики, институций государства и органов самоуправления постсоветских стран. Способность моральными истинами моделировать отношения единства противоположных сил, превращает человека в субьект диалектики форм культуры, искусства, политики.

Литература


1. Калинаускас, Р. Основы энергоэнтропики и человек. – Вильнюс, ВГТУ, Техника, 2008.(на литовском языке).
2. Аристотель. Избранные сочинения. – Вильнюс, 1990.(на литовском языке).
3. Отчет департамента статистики Литвы.- www.alfa.lt/2009.05.13.).
4. Райчинскис, К. Поиски и находки. – Каунас – Алитус, 1933-1994. (на литовском языке).


## РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ ЯК СУБ'ЕКТ МІЖНАРОДНЫХ КУЛЬТУРНЫХ АДНОСІН: АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПРАВАВЫ, КАНЦЭПТУАЛЬНЫ, ПРАКТЫЧНЫ АСПЕКТЫ


М.В. Стралец

*Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт, г. Брэст, Беларусь*


Мэта дадзенага даклада – даць комплексны аналіз удзелу постсавецкай Беларусі ў міжнародным культурным супрацоўніцтве. Такі аналіз яшчэ не праводзіўся ў навуковай літаратуры, і таму аўтар даклада спрабуе асвоіць прынцыпова новае праблемнае поле.

Перш за ўсё важна браць у разлік унутраныя дэтэрмінанты, якія вызначаюць знешнюю культурную палітыку Рэспублікі Беларусь. Ключавыя дэтэрмінанты такога кшталту: дасягненне рэальнай дзяржаўнай незалежнасці, посткамуністычная трансфармацыя. Датычна дадзеных дэтэрмінант трэба мець на ўвазе наступнае. "Знаходзячыся ў складзе іншых дзяржаў, беларускі народ быў вымушаны прыймаць правілы гульні, якія не заўсёды адпавядалі яго інтарэсам, лепшыя прадстаўнікі нацыі працавалі для фарміравання культурнага вобраза народаў, якія мелі палітычную перавагу. ...( З 1991 года. – М.С.) Рэспубліка Беларусь атрымала магчымасць самастойна вызначаць сваю ўнутраную і знешнюю культурную палітыку, распрацоўваць нарматыўна-прававые асновы міжнароднага культурнага ўзаемадзеяння, заключаць пагадненні з замежнымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі, фарміраваць механізм іх рэалізацыі. У краіне пачаўся працэс трансфармацыі сістэмы міжнароднага культурнага

супрацоўніцтва, якая склалася ва ўмовах адміністрацыйна-каманднай сістэмы, у новую дэмакратычную сістэму, якая абапіраецца на агульначалавечыя каштоўнасці і нацыянальныя інтарэсы. Дэмакратызацыя міжнародных сувязей спрыяла устараненню жорсткага партыйна-дзяржаўнага кантроля за формамі і зместам міжнародных культурных абменаў. Была разбурана "жалезная заслона", якая на працягу дзесяцігоддзяў перашкаджала развіццю кантактаў беларускага грамадства з еўрапейскай і сусветнай цывілізацыяй. Магчымасць самастойна усталёўваць замежныя кантакты атрымалі прафесійныя і самадзейныя мастацкія калектывы, установы культуры." [5].

Знешняя культурная палітыка Рэспублікі Беларусь распрацоўваецца і ажыццяўляецца ў той час, калі ў свеце рашуча пануе тэндэнцыя да глабалізацыі, няўхільна пашыраюцца геаграфічныя межы інфармацыйнага грамадства, у творчым працэсе тон задаюць постмадэрністы.

Арганізацыйная структура для распрацоўкі і ажыццяўлення знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь сфармавана з улікам адпаведных задач, якія былі вызначаны вышэйшым дзяржаўным кіраўніцтвам нашай краіны. У яе ўваходзяць віцэ-прэм'ер урада, які курыруе сацыяльны блок; адпаведныя структурныя падраздзяленні міністэрстваў: замежных спраў, адукацыі, культуры, інфармацыі; Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, аташэ па пытаннях культуры беларускіх амбасад; айчынныя дыпламаты, якія займаюцца пытаннямі, звязанымі з ЮНЕСКА, Цэнтральнаеўрапейскай Ініцыятывай; дамы беларускай культуры, якія размешчаны за мяжой. Пры гэтым выразна прасочваецца цеснае ўзаемадзеянне пералічаных структур з інстытутамі грамадзянскай супольнасці.

"Безумоўна, аташэ па пытаннях культуры – ключавая постаць у культурных сувязях паміж яго Айчынай і дзяржавай знаходжання амбасады. Яго функцыі наступныя:

- актыўная, мэтанакіраваная прапаганда айчынных культурных здабыткаў у краіне знаходжання;
- максімальная дапамога ў арганізацыі выстаў айчынных мастакоў, у ажыццяўленні гастроляў айчынных майстроў мастацтваў;
- сістэматычны аналіз вопыту дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, адукацыі, навукі ў краіне знаходжання;
- садзеянне ва ўсталяванні кантактаў паміж культурнымі, навуковымі, адукацыйнымі ўстановамі абедзвюх краін.

Зразумела, дзейнасць указаных структур дэтэрмінавана перш за ўсё месцам дадзенага аспекту ў курсе канкрэтнай дзяржавы на міжнароднай арэне" [6, с. 123]. "Актыўная вонкавая культурная палітыка не толькі спрыяе фарміраванню спрыяльнага вобразу краіны за мяжой, але ў многіх выпадках з'яўляецца важным стымулам эканамічнага развіцця. Праз культурныя сувязі можна дасягнуць узаемапаразумення і паглыблення эканамічных і палітычных адносін" [2, с. 89].

Былы Надзвычайны и Паўнамоцны Амбасадар Рэспублікі Беларусь у Польшчы Мікалай Крэчка мае рацыю, калі адзначае: "Культурная дыпламатыя... – гэта ці не самая шырокая магчымасць для рэкламы любой дзяржавы, для стварэння міжнароднага іміджу гэтай дзяржавы – выступае вельмі і вельмі важкім фактарам дыпламатычнай службы. І раней было так: першымі ідуць купцы, услед за імі – культура, а потым ужо крочыць палітыка. Праз гэту схему якраз сёння фарміруюцца стасункі з Беларуссю" [3, с. 9].

“Аднак на першым этапе існавання незалежнай Беларусі меліся і пэўныя цяжкасці ў галіне культурнага супрацоўніцтва...з іншымі краінамі. У пачатку 1990-х гг. не былі вызначаны прыярытэты культурнага супрацоўніцтва і яго накірункі. Гэта прыводзіла да пэўнай анархіі ў пошуку партнёраў за мяжой. У арганізацыі замежнай гастрольнай дзейнасці мелі месца адмоўныя тэндэнцыі, якія былі звязаны з адсутнасцю неабходнага вопыту міжнародных сувязяў, нарматыўнай базы, валодання валютным рахункам, неабходнага кантролю з боку ўстаноў культуры, адпаведных аддзелаў Міністэрства культуры. На Беларусі ... “культурны вектар быў паступова выключаны са знешнепалітычных прыярытэтаў”. Так, у Палажэнні аб Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь (1998 г.), якое рэгламентавала дзейнасць знешнепалітычнага ведамства, культурны вектар вонкавай палітыкі не ўзгадваецца. У аснову палітычнага курса, які быў узяты, была пакладзена ідэя аб тым, што ва ўмовах дэфіцыту сродкаў усе матэрыяльныя і інтэлектуальныя сродкі павіны быць сканцэнтраваны на эканамічным накірунку, які прыносіць хуткія дывідэнды, у адрозненне ад “доўгаграючых” адукацыі і культуры” [2, с. 89 – 90]. “Прынцыпова важна адзначыць , што ў пачатку XXI стагоддзя відавочна прасочваецца павышэнне ролі культурнай складовай ў курсе РБ у галіне міжнароднай палітыкі .” [6, с. 124].

Дамоўна-прававы базіс знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь уключае два аспекты.Першы аспект: блок канкрэтных міжнародных пагадненняў, у якіх у якасці аднаго з бакоў выступае афіцыйны Мінск. Гэты блок градзіруецца на двухбаковыя і шматбаковыя пагадненні.

Беларусь яшчэ ў савецкі перыяд падпісала наступныя міжнародныя канвенцыі аб ахове культурнай спадчыны: Канвенцыю аб абароне культурных каштоўнасцяў у выпадку ўзброенага канфлікта ад 14 траўня 1954 года, Канвенцыю аб мерах, якія накіраваны на забарону і папярэджанне незаконнага ўвозу, вывазу і перадачы ўласнасці на культурныя каштоўнасці ад 14 лістапада 1970 г., Канвенцыю аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны. У постсавецкі перыяд блок адпаведных пагадненняў папоўніўся Еўрапейскай культурнай канвенцыяй (1993 г.), Канвенцыяй краін Чарнаморскага рэгіёна аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі, навукі і інфармацыі. Беларусь мае з шэрагам дзяржаў спецыяльныя пагадненні аб культурным супрацоўніцтве. Яны заклалі трывалы падмурак для адпаведнай дзейнасці афіцыйнага Мінска на балгарскім, брытанскім, германскім, італьянскім, кіпрскім, расійскім, румынскім, славацкім, славенскім і іншых напрамках.

Другі аспект: прывядзенне ўнутранага заканадаўства ў адпаведнасць з міжнароднымі абавязацельствамі нашай краіны. Яшчэ ў ліпені 1991 года быў прыняты Закон “Аб культуры ў Беларускай ССР”. Праз 13 год набыла юрыдычную сілу яго новая рэдакцыя, у якой у лік “асноўных прынцыпаў ажыццяўлення і забеспячэння культурнай дзейнасці... (уключана. – М.С.) узаемадзеянне беларускай нацыянальнай культуры з культурамі іншых народаў і яе інтэграцыя ў сусветную культуру”. [1,с. 197 – 198]. З 13 лістапада 1992 года такую ж сілу набыў “Закон Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, найноўшая рэдакцыя якога датуецца 9 студзеня 2006 года.

Культурны твар сучаснай Беларусі ў глабальным інтэр'еры вызначаюць наступныя моманты. Першы момант.”У спіс Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКО ўключаны архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы, замкавы комплекс у г. п. Мір, Белавежская пушча і геадэзічная дуга Струве. У стадыі падрыхтоўкі знаходзіцца дасье па Аўгустоўскаму каналу, яшчэ дзевяць аб'ектаў нацыянальнага здабытку рэкамендаваны для ўключэння ў спіс экспертамі ЮНЕСКО” [4].

Другі момант. Беларускі тэатр трывала ўпісаўся ў тканіну міжнародных культурных адносін. Айчынныя "тэатры вядуць актыўную гастрольную дзейнасць, удзельнічаюць і заваёўваюць узнагароды ў прэстыжных міжнародных фестывалях, у ліку якіх Эдзінбургскі ў Велікабрытаніі, Шылераўскі і Бонскае біеннале ў Германіі, Шэкспіраўскі ў Іспаніі, Чэхаўскі ў Расіі і шмат іншых.

Цэнтрам тэатральнага жыцця міжнароднага маштаба перыядычна становіцца і сама Беларусь. У 2007 годзе на 12-й фестываль «Белая вежа» у Брэсце прыбылі тэатральныя калектывы з 25 краін. Ператварыўся ў сусветную сталіцу тэатра і Мінск – міжнародны форум «Панарама» прадстаўляе лепшыя ўзоры тэатральнага мастацтва ў пастаноўках вядучых калектываў з Расіі, Літвы, Украіны, Эстоніі, Швецыі, Ізраіля, Германіі і іншых краін. У 2008 годзе міжнародны фестываль лялечных тэатраў у беларускай сталіцы стаў адначасова падарункам да 70-годдзя Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек" [4].

Трэці момант. У міжнародным інтэр'еры грунтоўна выглядае беларускае кіно. "Кінастудыя «Беларусьфільм» – адна из вядучых ва Усходняй Еўропе. Тут паспяхова ажыццяўляюцца міжнародныя творчыя праекты па стварэнню мастацкіх фільмаў сумесна з кінематаграфістамі Расіі, Германіі, Ізраіля і іншых краін. Фільмы «Белвідэацэнтра» неаднойчы азначаліся прызамі і ўзнагародамі міжнародных кінафестываляў, такіх як, напрыклад, фестываль нацый у Аўстрыі, «Пасланне да чалавеку» (Санкт-Пецярбург), біеннале сучаснага мастацтва ў Цэнтры Пампіду (Парыж), «Залаты Віцязь» (Мінск, Масква) і інш. Вялікім поспехам на сусветных кінафорумах традыцыйна карыстаецца беларускае анімацыйнае кіно.

Падзеяй у рэспубліцы становіцца правядзенне агляду дасягненняў кінематаграфістаў розных краін. У 2007 годзе на конкурс X міжнароднага фестываля «Анімаеўка» у Магілеве было атабрана 37 прац аніматараў з 12 краін. Удзельнікі буйнейшага кінофорума «Лістапад-2007» – кінематаграфісты 33 краін свету" [4].

Чацвёрты момант. Значна больш разнастайным стала дачыненне Беларусі да міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне музыкальнай культуры.Шырокія маштабы набыў удзел нашай краіны ў міжнародных музычных фестывалях. Рэспубліка Беларусь пастаянна дэманструе здольнасць да арганізацыі падобных мерапрыемстваў на вышэйшым узроўні. Яскравае сведчанне таму – міжнародны музычны фестываль "Славянскі базар у Віцебску", які штогод праводзіцца пачынаючы з 1992 года. Важна таксама адзначыць, што "адной з асноўных асаблівасцей (сучаснага. – М.С.) музычнага жыцця Беларусі... з'яўляецца выхад на міжнародную арэну нетолькі ў галіне традыцыйных жанраў і кірункаў (балет, опера, музычны фальклор, песенная эстрада), што было і раней, а і ў галіне сучаснай авангарднай, эксперыментальнай музыкі" [7, с. 355 – 356].

Пяты момант. У розных краінах свету з відавочным поспехам праходзяць выставы айчынных мастакоў. Іх творы выклікаюць вялікую цікавасць з боку наведвальнікаў падобных выстаў.

Шосты момант. "Прызнанне за межамі рэспублікі атрымалі многія прадстаўнікі беларускай літаратуры...Так, прызнанне ў многіх еўрапейскіх краінах атрымала дакументальная проза С. Алексіевіч. Яе творы "У вайны не жаночы твар", "Цынкавыя хлопчыкі", "Апошнія сведкі", "Чарнобыльская малітва", "Зачараваныя смерцю" адказвалі настроям не толькі беларускіх, але і замежных чытачоў... Замежныя даследчыкі творчасці беларускай пісьменніцы адзначаюць яе бліскучы талент у паказе савецкай і постсавецкай рэчаіснасці". [1, с. 207]. Ва ўзнагародавую калекцыю С. Алексіевіч уваходзяць прэстыжныя прэміі розных краін. У далёкім і блізкім

замежжы таксама атрымалі шырокі рэзананс творы айчынных майстроў слова: В. Быкава, У. Арлова, А. Разанава, Н. Мацяш, А. Кудраўца, А. Паповай [1, с. 207].

У працэсе ажыццяўлення знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь сустракаюцца і праблемныя комплексы, зняцце якіх адпавядала б нацыянальным інтарэсам нашай краіны. Першы праблемны комплекс звязаны з вяртаннем з далёкага і блізкага замежжа культурных каштоўнасцяў, якія сапраўды належаць беларускаму народу. Другі праблемны комплекс: не вырашана мноства пытанняў на прадмет далучэння Беларусі да Балонскага працэса. Трэці праблемны комплекс: негатыўны ўплыў сучаснага сусветнага эканамічнага крызіса на магчымасці Беларусі як суб'екта міжнародных культурных адносін.

Такім чынам, за гады незалежнага існавання ўдзел Беларусі ў развіцці міжнароднага культурнага супрацоўніцтва набыў устойлівую дынаміку, што перманентна прасочваецца ў напаўненні рэальным зместам арганізацыйна-прававога, канцэптуальнага, практычнага аспектаў яе знешняй культурнай палітыкі. Разам з тым ёсць і праблемы, якія трэба неадкладна вырашаць у дадзеным накірунку.

Літаратура

1.Асновы культуралогіі: канспект лекцый / С.В. Снапкоўская, В.А. Вараб'ёва, В.М. Іўчанка, Н.І. Здановіч. – Мінск: Асар, 2008. – 272 с.

2. Малашук, П.В. Белорусско-югославские отношения (1953-2003гг.): Диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук / П.В. Малашук. – Минск: БГУ, 2005. – 136 с.

3. Крэчка, М. Нельга ускладаць праз палітычную прызму..." / М. Крэчка // Культура. – 2001. – №9. 5-9 сакавіка. – С.9

4. www.embassybel.ru/embassy/mbassador/ - 21k – 16 студзеня 2009 года.

5. Шадурский, В.Г. Внешняя культурная политика Республики Беларусь / В. Г. Шадурский / Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2000. – №4.– http://evolutio.info/index.php?option=com_content&task=view&id=387Itemid=51. – 27 апреля 2009 года.

6. Стралец, М.В. Асновы дыпламатычнай і консульскай службы: Курс лекцый. Вучэбнае выданне / М.В. Стралец . – Брэст: Установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт", 2008. – 188 с.

7. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі / С.А. Парашкоў. – 2-е выд. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 444 с.

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА Ў КНІГАВЫДАВЕЦКАЙ СПРАВЕ БССР З 1919 ПА 1941 ГОД: АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ

А.В. Сумко

*Установа адукацыі "Полацкі дзяржаўны універсітэт", г. Полацк, Беларусь*

З 1919 па 1941 год газеты і кнігі з'яўляліся не толькі носьбітам інфармацыі, але і сродкам палітычнага выхавання, мабілізацыі насельніцтва на выкананне задач гаспадарчага будаўніцтва. Яны адыгралі значную ролю ў справе кансалідацыі беларускай нацыі, калі казаць пра 1920-я гады, спрыялі пераўтварэнню каштоўнасцей сацыяльнай сістэмы ў асабістыя каштоўнасці індывіда ў 1930-я. Друкаваныя творы разглядаемага перыяду з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння трансфар-